# Віншаванне з Міжнародным Днём маці
# у аддзяленні кругласутачнага знаходжання
# для пажылых грамадзян і інвалідаў у а/г Жупраны

Гадзіна віншавання «З добрым сэрцам, з добрым словам» прайшла ў аддзяленні кругласутачнага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту і інвалідаў ДУ "ТЦСАН Ашмянскага раёна" аг. Жупраны.

Валанцёры з ліку пажылых грамадзян і работнікі цэнтра аддзялення сталага ўзросту і адзялення інвалідаў наведалі сваіх падапечных. Цёплыя словы віншаванняў чаргаваліся з душэўным спевам, тэатралізаванымі мініяцюрамі, жывой музыкай і добрымі ўсмешкамі. Мерапрыемства падарыла ўсім вясёлы настрой і масу яркіх уражанняў.

Дзень маці - Дзень падзякі, даніна глыбокай павагі і любові тым, хто падарыў нам жыццё.

